# WRO MIGRANT

Пункт інфармацыі для мігрантаў і ўцекачоў

BY

Мапа Уроцлава для новых жыхароў і жыхарак

## Уступ

### Вітаем ва Уроцлаве!

Спадзяёмся, што вы хутка адчуеце сябе тут як дома і пачнёце думаць пра Уроцлаў як пра наш супольны горад. Вы можаце ўзбагаціць яго сваёй прысутнасцю, досведам і культурай.

Мы падрыхтавалі для вас лістоўку з мапай Уроцлава, на якую нанеслі найважнейшыя месцы, дзе вы знойдзеце адказы на ключавыя пытанні і атрымаеце падтрымку падчас сваіх першых крокаў у горадзе.

Дадатковую падтрымку вы можаце атрымаць у гарадскім пункце інфармацыі для мігрантаў і бежанцаў WroMigrant, а таксама ў пунктах нашых партнёраў.

Дата публікацыі: сакавік 2026

## Медычная дапамога

### Нацыянальны фонд здароўя (NFZ)

NFZ — гэта ўстанова, якая фінансуе ахову здароўя ў Польшчы. Маючы страхоўку ад NFZ, вы можаце атрымліваць лячэнне бясплатна.

Вы застрахаваныя аўтаматычна, калі працуеце па дагаворы даручэння, працоўным дагаворы або вядзеце бізнес. Замежныя студэнты могуць застрахавацца добраахвотна. Асобы, застрахаваныя ў Польшчы, таксама могуць атрымаць **Еўрапейскую карту медыцынскага страхавання (EKUZ)**.

У рамках NFZ вы можаце запісацца да лекара першага кантакту, які з'яўляецца першай асобай, да якой Вы звяртаецеся ў выпадку праблемаў са здароўем. Лекар першага кантакту можа выпісаць рэцэпт, накіраваць вас на аналізы або да спецыяліста. NFZ кампенсуе выдаткі на некаторыя лекі, г.зн. у аптэцы вы заплаціце за іх менш.

Калі вы не ведаеце, у якую ўстанову звярнуцца, патэлефануйце на кругласутачную гарачую лінію NFZ **+48 800 190 590** на польскай мове, а ў будні дні з 8:00 да 18:00 таксама на мовах EN, UA, RU. Вы таксама знойдзеце шмат інфармацыі ў анлайн-акаунце пацыента на сайце **pacjent.gov.pl**.

### Даведкі па тэрмінах лячэння

Каб даведацца, дзе і калі вы можаце атрымаць найхутчэйшую дапамогу лекара, колькі людзей чакае на прыём у абранай вамі ўстанове і ці ёсць у шпіталі адпаведныя зручнасці для пацыентаў (напр., паркоўка, пандус для інвалідных калясак, ліфт або адаптаваны санвузел), вы можаце скарыстацца пошукавымі сістэмамі **terminyleczenia.nfz.gov.pl** або **pacjent.gov.pl/terminy-leczenia**.

### Аддзяленне неадкладнай дапамогі (SOR)

SOR — гэта аддзяленне бальніцы, дзе аказваецца неадкладная медыцынская дапамога ў надзвычайных сітуацыях. Звярніцеся ў SOR, калі з вамі здарыўся няшчасны выпадак, вы адчуваеце моцны боль, які ўзнік раптоўна, або маеце сімптомы, якія пагражаюць жыццю, такія як удушша або моцны крывацёк. Вам не патрэбна накіраванне ў SOR, тут таксама не дзейнічае прыпіска да месца пражывання. Пацыенты прымаюцца ў адпаведнасці з неадкладнай патрэбай у дапамозе — прыярытэт маюць тыя, хто знаходзіцца ў найбольш цяжкім стане.

### Медыцынская дапамога ўначы і ў выходныя (NiŚOZ)

Медыцынская дапамога ўначы і ў выходныя – гэта паслугі лекара і медсястры па-за працоўным часам, г.зн. у начны час (з 18:00 да 8:00), а таксама ў выходныя і святочныя дні. Вы можаце скарыстацца ёй, калі вы раптоўна захварэлі або ваш стан здароўя пагоршыўся, але непасрэднай пагрозы жыццю няма. Вы можаце атрымаць паслугі ў любым пункце медыцынскай дапамогі начнога і выходнага часу.

### Псіхалагічная падтрымка 24/7

Калі вы змагаецеся са стрэсам або адчуваеце дэпрэсію, патэлефануйце ў бясплатны кругласутачны Цэнтр падтрымкі дарослых асоб у псіхалагічным крызісе па нумары **+48 800 70 2222** (лінія на польскай мове). Больш інфармацыі на сайце **centrumwsparcia.pl**.

Тэлефон даверу для дзяцей і моладзі **+48 116 111** забяспечвае ананімную, бясплатную і кругласутачную падтрымку для асоб да 18 гадоў. Больш інфармацыі на сайце **116111.pl**.

Платформа **116sos.pl** і Крызісная лінія падтрымкі **+48 116 123** – гэта інструмент першага кантакту для дарослых, якія перажываюць крызіс.

## Адміністрацыйныя справы

### Цэнтры абслугоўвання жыхароў (COM)

Асноўныя адміністрацыйныя справы можна вырашыць у філіялах Гарадской адміністрацыі – Цэнтрах абслугоўвання жыхароў (COM):

1. зарэгістравацца і атрымаць пасведчанне аб рэгістрацыі,
2. атрымаць нумар PESEL,
3. асабіста пацвердзіць Даверены профіль, які можна стварыць анлайн на старонцы **pz.gov.pl**,
4. зарэгістраваць транспартны сродак, падаць заяўку на абмен замежнага пасведчання кіроўцы на польскае,
5. аплаціць мясцовыя падаткі і зборы (напр. за ўтылізацыю камунальных адходаў) і інш.

Праверыць, якія паслугі прапануе канкрэтны COM, і запісацца на візіт можна праз **bez-kolejki.um.wroc.pl**.

### Упраўленне грамадзянскага стану (USC)

Тут вы можаце зарэгістраваць нараджэнне дзіцяці і зрабіць для яго пасведчанне аб нараджэнні, а таксама ўзяць шлюб ці зарэгістраваць смерць. Вы таксама можаце ўнесці ў польскі рэестр грамадзянскага стану дакументы, выданыя за мяжой – пасведчанні аб нараджэнні, шлюбе або смерці.

### Падатковая інспекцыя

Калі вы перабываеце ў Польшчы больш за 183 дні ў годзе і маеце тут цэнтр жыццёвых інтарэсаў, вам надаецца статус польскага падатковага рэзідэнта. Звярніцеся ў Падатковую інспекцыю за пасведчаннем аб падатковым рэзідэнцтве. Пасведчанне дазваляе скарыстацца міжнароднымі пагадненнямі аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання паміж Польшчай ды іншымі краінамі. Праз афіцыйную старонку **podatki.gov.pl** вы можаце разлічыць падатковую дэкларацыю PIT або бясплатна падаць заяўку аб выдачы даведкі аб адсутнасці падатковай запазычанасці.

### Электронная платформа паслуг дзяржаўнага кіравання (ePUAP)

Дзякуючы **epuap.gov.pl** вы вырашыце шмат пытанняў у розных установах, не выходзячы з дому. Вам не трэба падпісваць заяўкі і лісты ўручную – для падпісу электронных дакументаў выкарыстоўваецца бясплатны Даверані профіль, які вы можаце стварыць на старонцы **pz.gov.pl**.

## Консульствы

### Генеральнае консульства Украіны

Генеральнае консульства Украіны выдае замежныя пашпарты для дзяцей і дарослых, часовыя пасведчанні асобы і выпіскі з рэестра грамадзянскага стану. Яно займаецца пытаннямі рэгістрацыі дзяцей, народжаных у консульскай акрузе, а таксама часовай і пастаяннай консульскай рэгістрацыяй. Консульства выконвае натарыяльныя паслугі, у тым ліку засведчвае даверанасці і подпісы на дакументах.

Каб запісацца на прыём, наведайце **go.mfa.gov.ua**. Падрабязную інфармацыю пра паслугі можна знайсці на сайце **wroclaw.mfa.gov.ua**.

### Генеральнае консульства Германіі

У Генеральным консульстве Германіі вы можаце падаць заяўку на атрыманне пашпарта або пасведчання асобы, атрымаць грамадзянства Германіі і зарэгістраваць дзіця, народжанае ў консульскай акрузе. Консульства таксама завярае подпісы і копіі дакументаў і займаецца іншымі консульскімі пытаннямі. Вы таксама можаце падаць тут заяву на атрыманне візы ў Германію.

**У пашпартным сэрвісе ДП «Дакумент» (ГЦ Pasaż Grunwaldzki, паверх 0) грамадзяне Украіны могуць аформіць замежны пашпарт, ID-карту, а таксама атрымаць апастыль.**

## Пункты інфармацыі для мігрантаў і мігрантак

### WroMigrant

*Уроцлаўскі цэнтр сацыяльнага развіцця (арганізацыйная адзінка Гміны Уроцлаў)*

Гарадскі пункт інфармацыі для мігрантаў/ак і ўцекачоў/уцякачак, дзе вы бясплатна атрымаеце інфармацыю, датычную адміністрацыйных спраў (напр., легалізацыі перабывання і працы, міжнароднай або часовай абароны, прысваення нумару PESEL) і штодзённых спраў (напр., адукацыі, медычнай дапамогі, сацыяльнай падтрымкі). Таксама тут даступныя кансультацыі з юрыстам, псіхолагам і інфармацыйныя сустрэчы на актуальныя тэмы. Мовы кансультацый: PL, UA, EN, BY, RU.

### Пераход Дыялогу

*Уроцлаўскі цэнтр сацыяльнага развіцця (арганізацыйная адзінка Гміны Уроцлаў)*

Пераход Дыялогу – гэта гарадская прастора для сустрэч і грамадскай дзейнасці ў цэнтры Уроцлава. Тут арганізоўваюцца інтэграцыйныя, культурныя і адукацыйныя падзеі для жыхароў Уроцлава кожнага ўзросту. У Пераходзе Дыялогу адбываюцца штодзённыя кансультацыі і іншыя мерапрыемствы гарадскога пункту інфармацыі для мігрантаў і ўцекачоў WroMigrant ды партнёрскіх арганізацый.

### Інстытут праў мігрантаў

*Фонд Украіна*

У рамках пункту інфармацыі для іншаземцаў вы атрымаеце кансультацыі ў адміністрацыйных, сямейных, рэгістрацыйных, медыцынскіх і жыллёвых справах, скансультуецеся з юрыстам па пытаннях працаўладкавання, працоўнага ці сямейнага права. У паслугах вы таксама знойдзеце анлайн і афлайн трэнінгі і курсы. Мовы кансультацый: PL, UA, EN, RU.

### Таварыства Nomada

Бясплатная падтрымка для мігрантаў і ўцекачоў: пытанні легалізацыі перабывання і атрымання міжнароднай абароны, працаўнічыя правы, сямейнае права і доступ да сацыяльных паслуг і выплат. Паслугі суправаджэння ў афіцыйных установах (упраўленнях, паліцыі, памежнай службе і г.д.). Падтрымка ў сітуацыях гвалту, матываванага прадузятасцю (расізм/ксенафобія), прыналежнасцю да пэўнага полу, хатняга гвалту. Мовы кансультацый: PL, UA, EN, RU, ES (калі магчыма, таксама іншыя – у адпаведнасці з патрэбамі асоб, якія звяртаюцца).

## Адукацыя

### Уроцлаўскі комплекс ясляў

*(арганізацыйная адзінка Гміны Уроцлаў)*

Уроцлаўскі комплекс ясляў кіруе сеткай ясляў, якія прапануюць прафесійную апеку, выхаванне і адукацыю дзяцей ва ўзросце ад 20 тыдняў да 3 гадоў.

Вы можаце запісаць дзіця да ясляў праз Даверены профіль на сайце **rekrutacja-zlobki.um.wroc.pl**.

### Дэпартамент адукацыі

*(гарадская адміністрацыя Уроцлава)*

Дэпартамент адукацыі кантралюе дзейнасць навучальных устаноў у фінансавых, адміністрацыйных і арганізацыйных пытаннях.

На **rekrutacje.edu.wroclaw.pl** вы можаце знайсці ўстанову і прыняць удзел у працэсе набору ў дашкольныя ўстановы і дашкольныя класы (3-6 гадоў), першыя класы пачатковых школ і сярэднія школы. Набор праводзіцца ў пэўныя тэрміны; па-за гэтымі тэрмінамі трэба кантактаваць непасрэдна з навучальнай установай.

### Кураторыюм асветы ва Уроцлаве

Бацькі маюць права паведаміць у Кураторыюм асветы пра парушэнні, якія супярэчаць заканадаўству аб адукацыі або ўплываюць на якасць навучання вучняў.

Зварот павінен абапірацца на факты і быць добра абгрунтаваным, бо Кураторыюм не разглядае асабістыя канфлікты або школьныя рашэнні, якія не парушаюць закон.

### Фонд Дом міру

Фонд прапануе бясплатныя паслугі па правядзенню перамоваў для жыхароў і школ Уроцлава ў рамках праграмы «Хуткая медыяцыйная дапамога», мэтай якой з'яўляецца вырашэнне канфліктаў і паляпшэнне адносін у групе. Калі вы жадаеце скарыстацца падтрымкай медыятара, патэлефануйце ў «Хуткую медыяцыйную дапамогу» па нумары **+48 538 208 660** або напішыце на электронную пошту **pogotowie.mediacyjne@wcrs.pl**.

### Міжшкольны цэнтр падтрымкі прафесійнай дзейнасці (MOWAZ)

MOWAZ падтрымлівае вучняў пачатковых і сярэдніх школ Уроцлава ў планаванні іх адукацыйных і кар'ерных шляхоў, прадастаўляе інфармацыю аб прафесіях і кваліфікацыях, а таксама аб адукацыйных прапановах сярэдніх школ Уроцлава. Адукацыйныя матэрыялы на розных мовах даступныя на сайце **doradcy-wroclaw.pl**.

### Study in Wroclaw

У межах гарадскога праекта, які рэалізуецца ў супрацоўніцтве ўладаў Уроцлава і мясцовых універсітэтаў, вы можаце атрымаць бясплатную інфармацыю пра ўроцлаўскія ўніверсітэты, атрымаць падтрымку падчас паступлення, а таксама прыняць удзел у сустрэчах, якія спрыяюць адаптацыі ў новым асяроддзі. Больш інфармацыі на **study-in-wroclaw.pl**.

### Платформы для самастойнага вывучэння польскай мовы

**Popolskupopolsce.edu.pl**, **polski.info, polskijazyk.pl** — гэта адукацыйныя платформы, створаныя пры падтрымцы польскіх міністэрстваў, універсітэтаў, няўрадавых арганізацый і еўрапейскіх фондаў.

### Навучальныя матэрыялы

На сайце Упраўлення па справах іншаземцаў **gov.pl/web/udsc/-materialy-dydaktyczne-do-nauki-jezyka-polskiego** у бясплатным доступе вы знойдзеце падручнікі польскай мовы для дзяцей і дарослых рознага ўзроўню валодання мовай.

## Вывучэнне польскай мовы

### Уроцлаў на мовах свету

Гарадская праграма, якую рэалізуе Уроцлаўскі інтэграцыйны цэнтр, мэтай якой з'яўляецца стварэнне прасторы для вывучэння польскай мовы ў форме партнёрскіх сустрэч — так званых моўных тандэмаў.

Праграма зводзіць людзей, якія жадаюць практыкаваць польскую мову, з валанцёрамі, якія падтрымліваюць іх у навучанні і развіцці камунікатыўных навыкаў.

Для ўдзелу зарэгіструйцеся на старонцы **wnjs.pl**.

## Перабыванне і праца

### Ніжнесілезскае ваяводскае ўпраўленне (DUW)

Тут вы можаце падаць заяўку на розныя тыпы дазволаў (напр., дазвол на часовае ці пастаяннае перабыванне), пасля выдачы якіх вы атрымаеце карту перабывання. Грамадзяне краін ЕС і члены іх бліжэйшай сям'і могуць падаць заяўку на рэгістрацыю перабывання.

На парталах **przybysz.duw.pl** і **mos.cudzoziemcy.gov.pl** вы можаце знайсці падрабязную інфармацыю аб легалізацыі перабывання.

Кожны іншаземец з-за межаў ЕС абавязаны паклапаціцца пра легальнасць свайго працаўладкавання. За дазволам на працу тыпу A або B для іншаземца заўсёды звяртаецца працадаўца. Заяўку трэба скласці праз старонку **praca.gov.pl**.

### Памежная служба

Памежная служба займаецца кантролем памежнага руху і валодае інфармацыяй аб легалізацыі перабывання, правілах перасячэння межаў Польшчы і сітуацыі на памежных пераходах. Тут вы таксама можаце даведацца пра працэдуру анулявання забароны на ўезд у Польшчу або паведаміць пра памылкі ў запісах у рэестрах Памежнай службы. Вы маеце права падаць заяўку на прадастаўленне міжнароднай абароны (статус уцекача або дадатковая абарона). Для гэтага вам неабходна запісацца на прыём у пункце Памежнай службы ва Уроцлаве.

### Ваяводскае ўпраўленне працы ва Уроцлаве (WUP)

WUP прапануе працу ва ўсім ваяводстве і іншых краінах ЕС. Тут таксама дзейнічае Цэнтр кар'ернага кансультавання, дзе вы можаце атрымаць інфармацыю аб рынку працы, спосабах і метадах найму і магчымасцях кар'ернага развіцця.

На **wroclaw.pl** спампуйце **«Даведнік прадпрымальніка Уроцлава»** (даступны на PL, EN, UA мовах), у якім вы даведаецеся, як стварыць індывідуальнае прадпрыемства ці камерцыйнае таварыства, а таксама як аформіць неабходныя рэгістрацыі, ліцэнзіі і дазволы.

### Павятовае ўпраўленне працы (PUP) і Зялёная лінія

Калі вы маеце складанасці з пошукам працы, можаце звярнуцца ў PUP, каб атрымаць інфармацыю пра актуальныя прапановы. Аб'яўленні даступныя таксама на **oferty.praca.gov.pl**.

Вы можаце таксама зарэгістравацца ў PUP як асоба ў пошуку працы або беспрацоўная асоба. У залежнасці ад вашай сітуацыі ўпраўленне можа запрапанаваць адпаведныя формы падтрымкі, напрыклад, навучанне для павышэння кваліфікацыі.

Калі вы з'яўляецеся грамадзянінам Арменіі, Беларусі, Малдовы ці Украіны, ваш працадаўца можа зарэгістраваць ва Упраўленні дэкларацыю аб даручэнні працы іншаземцу, якая дазваляе вам легальна працаваць у Польшчы да 24 месяцаў без неабходнасці атрымання дазволу на працу.

Калі вам ці вашаму працадаўцы патрэбная інфармацыя аб правах і абавязках, дагаворах і ўмовах працы, вы можаце скарыстацца бясплатнай гарачай лініяй Інфармацыйна-кансультацыйнага цэнтра Службы занятасці «Зялёная лінія» па нумары **+48 19524**.

### Дзяржаўная інспекцыя працы (PIP)

Інспекцыя працы ва Уроцлаве кантралюе выкананне палажэнняў працоўнага заканадаўства, у тым ліку правілаў законнасці працаўладкавання, працоўных адносінаў, аплаты працы, аховы працы. Як працаўнік, вы маеце права абараняць свае працоўныя правы, складаючы зварот у PIP. Даведацца больш можна на старонцы **wroclaw.pip.gov.pl**.

### Цэнтральны рэестр і інфармацыя аб гаспадарчай дзейнасці (CEIDG)

Калі вы, як замежнік, хочаце займацца індывідуальным прадпрымальніцтвам, вы павінны праверыць, ці маеце на гэта права, а потым зарэгістравацца ў CEIDG. Гэта афіцыйны рэестр прадпрымальнікаў у Польшчы. Працэдура рэгістрацыі бясплатная, зрабіць гэта можна анлайн або ў офісе. Скарыстайцеся гарачай лініяй CEIDG па нумарах **+48 801 055 088, +48 22 765 67 32**.

## Бяспека

### Нумары экстраных службаў

**112 – Адзіны еўрапейскі нумар экстранай дапамогі**

**997 – Паліцыя**

**998 – Пажарная служба**

**999 – Хуткая медыцынская дапамога**

**986 – Гарадская служба грамадскага парадку**

**984 – Дабраахвотная служба выратавання на вадзе (WOPR)**

### Супрацьдзеянне гандлю людзьмі

Патэлефануйце ў Нацыянальны аператыўна-кансультацыйны цэнтр для ахвяр гандлю людзьмі, калі хтосьці забраў вашыя дакументы, збівае вас, пагражае, шантажуе, прымушае да працы, прастытуцыі, жабравання або крадзяжу: **+48 22 628 01 20, +48 605 687 750.**

### Прыбіранне мовы нянавісці з грамадскай прасторы

Калі вы заўважылі абразлівы надпіс або сімвал на сцяне, на прыпынку або іншай паверхні, паведаміце пра гэта Уроцлаўскі інтэграцыйны цэнтр праз платформу **wcsn.pl**. Асуджаныя асобы пры Уроцлаўскім цэнтры папраўчага правасуддзя ў рамках сваёй грамадскай працы выдаляюць надпісы і сімвалы, якія распальваюць нянавісць.

## Сацыяльная падтрымка

### Гарадскі цэнтр сацыяльнай дапамогі (MOPS)

MOPS — гэта месца, дзе вы можаце атрымаць падтрымку ў цяжкіх жыццёвых сітуацыях, напрыклад, калі ў вас нізкі даход, праблемы з арэндай жылля, вам патрэбна дапамога ў выхаванні дзяцей або падтрымка ў паўсядзённым жыцці. У MOPS вы можаце распытаць пра ільготы, матэрыяльную дапамогу (напр., ежу, адзенне) і праграмы падтрымкі сем'яў, людзей сталага ўзросту і людзей з інваліднасцю.

Вы можаце падаць заяву на атрыманне пасведчання аб інваліднасці ў Раённы аддзел па вызначэнні інваліднасці. Асобы, якія знаходзяцца пад міжнароднай абаронай, могуць атрымаць падтрымку ў Аддзеле па справах уцекачоў.

**Увага! Калі вы або іншая асоба знаходзіцеся ў стане бяздомнасці, патэлефануйце па нумары +48 71 78 23 584 (Аддзел па справах асоб у крызісе бяздомнасці пры MOPS) або па нумары +48 800 292 137 (Таварыства дапамогі імя святога Брата Альберта), каб атрымаць дапамогу.**

### Установа сацыяльнага страхавання (ZUS)

ZUS — гэта ўстанова, якая збірае ўзносы на сацыяльнае і медыцынскае страхаванне, а затым выплачвае розныя тыпы дапамогі. У аддзяленнях ZUS ва Уроцлаве вы можаце атрымаць асноўную інфармацыю пра належныя і выплачаныя ўзносы, выплаты для сем'яў (800+, «Добры старт», «Актыўныя бацькі» і г.д.), пенсіі, іншыя выплаты і дапамогі. Большасць спраў вырашаецца праз платформу **zus.pl**.

### Сацыяльнае жыллё ва Уроцлаве

Аддзел жылых памяшканняў гарадской адміністрацыі Уроцлава мае ў сваім фондзе тры віды жылля: сацыяльныя і камунальныя кватэры, а таксама кватэры за рамонт. Падаць заяву на атрыманне жылля могуць таксама замежнікі, якія легальна пражываюць у Польшчы, не маюць забяспечаных жыллёвых умоў і адпавядаюць даходным крытэрыям. Больш інфармацыі можна знайсці на старонцы **bip.um.wroc.pl.**




# Гарадскі транспарт

**Цэнтры абслугоўвання кліентаў URBANCARD (BOK)**

У BOK вы можаце атрымаць пластыкавую карту Urbancard, на якой можна запісаць любы электронны білет, тут таксама можна падаць скаргу або атрымаць рахунак-фактуру за білет. Заяўку на карту можна скласці анлайн, атрымаць яе на працягу двух рабочых дзён. Студэнты могуць актываваць білет на сваім студэнцкім білеце.

Вы таксама можаце набыць аднаразовыя і абмежаваныя па часе білеты праз мабільны дадатак Urbancard, у білетных аўтаматах на прыпынках або непасрэдна ў транспарце (аплата толькі бескантактавай картай).

Бясплатны праезд у грамадскім транспарце Уроцлава даступны для дзяцей да 7 гадоў, вучняў школ з дзеючым школьным білетам да 21 года і пенсіянераў, якім споўнілася 65 гадоў.

## ПУНКТЫ ІНФАРМАЦЫІ ДЛЯ МІГРАНТАЎ І МІГРАНТАК

**1 WroMigrant – гарадскі пункт інфармацыі для мігрантаў і ўцекачоў**

Уроцлаўскі цэнтр сацыяльнага развіцця
Асабістыя кансультацыі:
пн–сб 12:00–16:00
Пераход Дыялогу, ul. Świdnicka 19 (падземны пераход)
Дыстанцыйныя кансультацыі:
пн–пт 9:00–17:00
e-mail: wromigrant@wcrs.pl
+48 71 772 49 50
+48 538 579 517
+48 735 969 992 (Viber)
+48 538 579 555 (Viber)

**2 Пераход Дыялогу – гарадская прастора для сустрэч і сацыяльных мерапрыемстваў**

Уроцлаўскі цэнтр сацыяльнага развіцця
ul. Świdnicka 19 (падземны пераход)
пн–пт 9:00–17:00
сб 10:00–16:00
e-mail: przejsciedialogu@wcrs.pl
+48 71 798 64 99

**3 Інстытут праў мігрантаў – пункт інфармацыі для іншаземцаў**

Фонд Украіна
ul. Ruska 46a/202 (№ 3 на дамафоне)
пн 09:00–18:00
аў–сб 09:00–17:00
e-mail: zapisy@instytutpm.eu
+48 510 011 846

**4 Таварыства Nomada**

ul. Stanisława Dubois 11–13
пн 11:00–18:00
аў, ср, пт 9:00–16:00
чц 11:00–16:00
email: help@nomada.info.pl (UA, RU)
counselling@nomada.info.pl (EN)
+48 536 149 008 (UA, RU)
+48 791 576 459 (EN)

## МЕДЫЧНАЯ ДАПАМОГА

**5 Нацыянальны фонд здароўя (NFZ) Ніжнесілезскае ваяводскае аддзяленне ва Уроцлаве**

ul. Generała Romualda Traugutta 55
e-mail: kancelaria@nfz-wroclaw.pl
+48 71 797 93 25

**Аддзяленні неадкладнай дапамогі (SOR) ва Уроцлаве, Медыцынская дапамога ўначы і ў выходныя (NiŚOZ) ва Уроцлаве**

*Ніжнесілезская спецыялізаваная бальніца імя Т. Марцінака*
ul. Gen. Augusta Emila Fieldorfa 2
SOR для дарослых
+48 71 306 43 00
+48 71 306 43 20
SOR для дзяцей
+48 71 306 43 14
NiŚOZ
+ 48 71 306 42 22

*Ваяводская спецыялізаваная бальніца*
ul. Kamieńskiego 73a
SOR
+48 71 327 03 68
NiŚOZ
+48 71 327 05 36

*Універсітэцкая клінічная бальніца*
ul. Borowska 213
SOR
+48 71 733 29 64

*Ваенны клінічны шпіталь*
ul. Rudolfa Weigla 5
SOR
+48 261 660 130

*Ваяводская спецыялізаваная бальніца імя Я. Грамкоўскага*
ul. Koszarowa 5
NiŚOZ
+48 71 395 76 07

*Спецыялізаваная бальніца імя А. Фалькевіча*
ul. Warszawska 2
NiŚOZ
+48 71 377 41 16,
+48 883 372 776

## АДУКАЦЫЯ

**6 Куратарыюм асветы ва Уроцлаве**

plac Powstańców Warszawy 1
+48 71 340 63 36

**7 Дэпартамент адукацыі Гарадской адміністрацыі Уроцлава**

ul. W. Bogusławskiego 8,10
Сакратарыят
V паверх, пак. 503
+48 71 777 85 16

Аддзел дашкольных устаноў адукацыі
Аддзел пачатковых школ
+48 71 777 87 06

Аддзел сярэдніх школ
+48 71 777 77 91

**Уроцлаўскі комплекс ясляў**

ul. Fabryczna 15
e-mail: sekretariat@wzz.wroc.pl
+48 71 718 62 46

**8 Study in Wrocław**

pl. Solny 14
e-mail: study-in-wroclaw@araw.pl
+48 728 388 907 (Viber, WhatsApp)

## АДМІНІСТРАЦЫЙНЫЯ СПРАВЫ

**Цэнтр абслугоўвання жыхароў (COM) Гарадской адміністрацыі**

9 ul. G. Zapolskiej 4
10 pl. Nowy Targ 1-8
al. Kromera 44
ul. Legnicka 58 (CH MagnoliaPark)
+48 71 777 77 77

**11 Упраўленне рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану (USC)**

ul. P. Włodkowica 20
+48 71 777 99 67

**Падатковая інспекцыя (ПІ)**

12 *ПІ Wrocław-Stare Miasto*
ul. Inowrocławska 4

13 *ПІ Wrocław-Śródmieście*
ul. marsz. Józefa Piłsudskiego 27-29

*ПІ Wrocław-Krzyki*
ul. Sztabowa 100

*ПІ Wrocław-Fabryczna*
ul. Aleksandra Ostrowskiego 5

*ПІ Wrocław-Psie Pole*
ul. Trzebnicka 33

## КОНСУЛЬСТВЫ

**14 Генеральнае консульства Украіны ва Уроцлаве**

plac Nankiera 7
e-mail: gc_plw@mfa.gov.ua
e-mail: konsulatwroclaw@gmail.com
+48 71 712 00 00

**15 Генеральнае консульства Германіі ва Уроцлаве**

ul. Podwale 76
+48 71 377 27 00

**16 Пашпартны сэрвіс ДП «Дакумент» для грамадзян Украіны**

Plac Grunwaldzki 22 (CH Pasaż Grunwaldzki, паверх 0)
wroclaw.pasport.org.ua
+48 451 106 881

## ПЕРАБЫВАННЕ І ПРАЦА

**17 Ніжнесілезскае ваяводскае ўпраўленне (DUW)**

pl. Powstańców Warszawy 1
+48 71 701 11 00
пн–пт. 8.00–16.00
ср 8.00–18.00

**Памежная служба**

ul. Graniczna 105a
e-mail: wroclawstrachowice@strazgraniczna.pl
+48 71 358 47 00
+48 71 358 47 02
+48 71 358 47 10

**Павятовае ўпраўленне працы (PUP)**

ul. Gliniana 20-22
e-mail: wrwr@pup-wroclaw.pl
+48 71 770 16 40
+48 71 770 18 25

**Ваяводскае ўпраўленне працы ва Уроцлаве (WUP)**

Цэнтр кар'ернага кансультавання ва Уроцлаве
ul. Eugeniusza Kwiatkowskiego 4
+48 71 39 74 315
+48 71 39 74 316
+48 71 39 74 268
e-mail: wroclaw.ciz@dwup.pl

**Дзяржаўная інспекцыя працы ва Уроцлаве (PIP)**

ul. Zielonego Dębu 22
e-mail: kancelaria@wroclaw.pip.gov.pl
+48 71 37 10 430
+48 71 39 74 316

## САЦЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА

**Установа сацыяльнага страхавання (ZUS)**

ul. B.Prefficza 11,
18 ul. Litomska 36,
ul. Reymonta 4-6
+48 22 560 16 00

**19 Гарадскі цэнтр сацыяльнай дапамогі ва Уроцлаве (MOPS)**

ul. Strzegomska 6
mops.wroclaw.pl
e-mail: sekretariat@mops.wroclaw.pl
+48 71 78 22 322

**20 Раённы аддзел па вызначэнні інваліднасці (MOPS)**

Pl. Solidarności 1/3/5
0 паверх
e-mail: pzon@mops.wroclaw.pl
+48 71 78 22 360
+48 71 7822 362
+48 71 78 22 363

**21 Аддзел падтрымкі асоб з інваліднасцю (MOPS)**

ul. Strzegomska 6
e-mail: dwon@mops.wroclaw.pl
+48 71 78 22 339
+48 78 22 342
+48 78 22 357

**22 Аддзел супрацьдзеяння хатняму гвалту (MOPS)**

ul. Owsiana 4-6
e-mail: dppd@mops.wroclaw.pl
+48 71 78 23 591
+48 71 79 64 088

**23 Аддзел па справах уцекачоў (MOPS)**

ul. gen. Jana Henryka Dąbrowskiego 11/u1
+48 71 738 84 62
e-mail: zuch@mops.wroclaw.pl

**24 Аддзел па справах асоб у крызісе бяздомнасці (MOPS)**

ul. Zachodnia 3
+48 71 782 35 84
e-mail: zobu@mops.wroclaw.pl

**25 Аддзел жылых памяшканняў**

pl. Nowy Targ 1-8
II паверх , пак. 217
+48 71 777 84 22
e-mail: wlm@um.wroc.pl

## ГАРАДСКІ ТРАНСПАРТ

**Цэнтры абслугоўвання кліентаў URBANCARD (BOK)**

26 ul. Grabiszyńska 9
ul. Ractawicka 2-4
27 ul. Ładna 1c
al. Kromera 21a
ul. Świeradowska 22
e-mail: bok@urbancard.pl
+48 71 34 11 200